# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

УДК [01+02+002.2]:001.8:378.4:[008+7](476-25)(091)

*М. А. Яцэвіч*

## Навукова-педагагічная школа ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (да 20-годдзя стварэння)

*Прааналізавана станаўленне навукова-педагагічнай школы ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства  Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Апісваюцца арганізацыя школы і яе дасягненні за 20 гадоў існавання: абароненыя дысертацыі, даследаванні, выдадзеныя вучэбныя і навукова-практычныя дапаможнікі, распрацаваныя праграмы вучэбных дысцыплін, апублікаваныя артыкулы, манаграфіі, зборнікі артыкулаў і інш.  Аўтар адзначае шэраг праблем, якія ўзнікаюць у дзейнасці навуковай школы, і прапануе шляхі іх вырашэння.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2014 г. у бібліятэчнай справе Беларусі адбыліся дзве значныя падзеі: 70-годдзе вышэйшай бібліятэчнай адукацыі і 20-годдзе стварэння нацыянальнай навуковай школы ў галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», якая па тыпе з'яўляецца навукова-педагагічнай. Гэтыя падзеі ўзаемазвязаны. Прааналізуем станаўленне, дасягненні, арганізацыю і праблемы навуковых даследаванняў у межах вышэйназванай школы.

З моманту набыцця дзяржаўнай незалежнасці ў Беларусі востра паўстала пытанне стварэння нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве.

Навуковая школа бярэ пачатак у 1990 г., калі на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры была адкрыта аспірантура па спецыяльнасці 05.25.03 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, а ў 1994 г. школа была афіцыйна зацвер-



**Мікалай Аляксандравіч Яцэвіч**

Кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

джана Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй (ВАК) Рэспублікі Беларусь. У 1996 г. пачала дзейнічаць магістратура па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», якая разглядалася як пераходная ступень для навучання ў аспірантуры. Заснавальнікам і пастаянным кіраўніком школы з'яўляецца доктар педагагічных навук, прафесар, правадзейны член грамадскай арганізацыі (ГА) «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі пры ААН» (г. Масква), член-карэспандэнт ГА «Беларуская акадэмія адукацыі», прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) В. Е. Лявончыкаў.

Каб атрымаць адпаведныя ўмовы для абароны дысертацый, намаганнямі ўніверсітэта ў чэрвені 1994 г. быў створаны і дзейнічаў па чэрвень 1999 г. савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. У маі 2001 г. быў створаны эксперыментальны савет па абароне доктарскіх дысертацый (на два гады). Эксперымент аказаўся ўдалым. За два гады былі абаронены дзве доктарскія дысертацыі: адна па бібліятэказнаўстве (Р. С. Матульскі) і адна па тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці (Я. Д. Грыгаровіч). Таксама былі абаронены сем кандыдацкіх, у тым ліку тры па бібліятэказнаўстве. Зараз пры ўніверсітэце дзейнічае савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па дзвюх спецыяльнасцях: «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», а таксама па «тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці». У 1998 г. была створана дактарантура.

Сёння інтэлектуальную аснову навуковай школы складае прафесарска-выкладчыцкі склад кафедраў тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, інфармацыйных рэсурсаў, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якія абаранялі дысертацыі ў спецыялізаваным навуковым савеце БДУКМ, а таксама прадстаўнікі іншых устаноў.

Праблематыка даследаванняў і распрацовак у навуковай школе ўключае пытанні гісторыі, тэорыі, метадалогіі, методыкі, тэхналогіі, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, бібліяграфіі, кніжнай культуры. Паколькі навуковая школа ўтворана ў галіне педагогікі, вялікая ўвага ў даследаваннях надаецца распрацоўцы педагагічных аспектаў, якія звязаны з выкарыстаннем кнігі, інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў у развіцці асобы, выхаванні і адукацыі ва ўмовах бібліятэчна-інфармацыйных устаноў. Падрабязна аб галінах дысертацыйных даследаванняў напісана ў пашпарце навуковай спецыяльнасці 05.25.03 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, які зацвярджаецца ВАК Беларусі, пастаянна пераглядаецца і актуалізуецца ў межах навуковай школы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

За час існавання навуковай школы былі абаронены 1 доктарская (Р. С. Матульскі) і 18 кандыдацкіх дысертацый. Найбольшая колькасць кандыдацкіх дысертацый была абаронена пад кіраўніцтвам прафесараў В. Е. Лявончыкава (5) і Р. С. Матульскага (3). Пад кіраўніцтвам дацэнтаў С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянковай, М. А. Яцэвіча абаронена па дзве дысертацыі; У. А. Акуліча, Л. А. Дзямешкі, В. А. Касап, Н. А. Ляйко – па адной. Сярод уладальнікаў вучонай ступені кандыдата педагагічных навук – пяць грамадзян замежных краін (Іарданіі, Ірака, Камеруна, Сірыі).

Колькасна і якасна навукова-педагагічная школа ў 2015 г. складаецца з чатырох дактароў (В. У. Буткевіч, В. Е. Лявончыкаў, Р. С. Матульскі, В. В. Нешытой) і 30 кандыдатаў навук (У. А. Акуліч, В. М. Бігеза, В. І. Брычкоўскі, Н. Ю. Бярозкіна, Н. Ю. Вайцэховіч, Ю. М. Галкоўская, Л. А. Дзямешка, А. Е. Далгаполава, Л. І. Доўнар, І. У. Дрыга, С. В. Зыгмантовіч, С. У. Ільіна, В. А. Касап, Н. У. Клімянкова, А. Ю. Казленка, Т. В. Кузьмініч, Н. А. Ляйко, С. А. Паўлава, Ю. А. Пераверзева, Б. В. Пятрэнка, Н. Я. Пятушка, А. В. Прадзеіна, Л. І. Ракавецкая, Р. А. Ровіна, В. І. Саітава, І. Б. Стралкова, Э. С. Суддзя, А. А. Суша, А. М. Фёдарава, М. А. Яцэвіч). У састаў навуковай школы ўваходзяць аспіранты і выпускнікі аспірантуры, якія маюць навуковыя публікацыі, але яшчэ не абаранілі кандыдацкія дысертацыі, а таксама выпускнікі магістратуры.

У пераліку ўдзельнікаў навукова-педагагічнай школы ёсць асобныя вучоныя, якія не маюць базавай бібліятэчнай адукацыі. Але яны даўно займаюцца бібліятэчнымі праблемамі, праблемамі кнігазнаўства, друкуюць адпаведныя навуковыя працы. Менавіта інтэграцыя дзейнасці бібліятэказнаўцаў і прадстаўнікоў іншых навук і ёсць аснова паспяховага развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай справы Беларусі.

За час існавання навукова-педагагічнай школы распрацаваны чатыры комплексныя навукова-даследчыя тэмы па найбольш актуальных праблемах бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і кнігазнаўства. У 2015 г. на спецыяльных кафедрах ФІДК БДУКМ, якія, як ужо адзначалася, з'яўляюцца ядром школы, завяршаецца пяцігадовае даследаванне комплекснай навуковай тэмы «Дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь па захаванні і распаўсюджванні дакументальнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі». У межах комплекснай тэмы завяршаецца выкананне трох кафедральных: «Кніжная бібліятэчная і бібліяграфічная справа ў сістэме бесперапыннай адукацыі Беларусі» (навуковы кіраўнік – дацэнт Л. І. Доўнар), «Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк Беларусі і іх бяспека ва ўмовах глабалізацыі» (прафесар В. В. Нешытой), «Бібліятэкі Беларусі ў грамадстве ведаў: арганізацыя раўнапраўнага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей» (дацэнт С. В. Зыгмантовіч).

Вынікі даследаванняў адлюстраваны ў навуковых публікацыях, дакладах на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, у вучэбных і навукова-практычных дапаможніках, вучэбна-метадычных комплексах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па дысцыплінах, ва ўкараненнях у дзейнасць бібліятэк і вучэбны працэс ФІДК. У межах школы праводзіліся метадалагічныя семінары па актуальных пытаннях бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Апошні адбыўся ў лютым 2014 г. у БДУКМ. Былі прааналізаваны сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі бібліятэказнаўства ў кантэксце сусветнага стану навукі, патрэбы і магчымасці бібліятэк Беларусі, метадалагічныя падыходы ў навуковых даследаваннях, гісторыя беларускай кнігі як аб'екта навуковых даследаванняў, адкрыты доступ да інфармацыі як навуковая праблема і інш.

Па выніках даследаванняў толькі за апошнія 10 гадоў было апублікавана звыш 600 навуковых і навукова-метадычных прац, сярод якіх навуковыя артыкулы, 11 манаграфій, 5 зборнікаў навуковых артыкулаў, 4 зборнікі матэрыялаў канферэнцый, прысвечаных юбілеям ФІДК, 27 вучэбных і 8 навукова-практычных дапаможнікаў, 4 адукацыйныя стандарты, вялікая колькасць тыпавых вучэбных праграм. Навуковыя працы друкаваліся ў ЗША, Казахстане, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Украіне і інш. краінах.

Падкрэслім, што ў разглядаемы перыяд у цэлым вырашана праблема падрыхтоўкі нацыянальных вучэбных дапаможнікаў па большасці агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, якія зафіксаваны ў адукацыйных стандартах: «Гісторыя беларускай кнігі» (Л. І. Доўнар), «Дакументазнаўства» (В. А. Касап), «Общее библиотековедение» (Р. С. Матульскі), «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» (Т. В. Кузьмініч), «Сусветная гісторыя бібліяграфіі» (В. І. Саітава), «Каталагізацыя дакументаў» у 3-х частках (Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына), «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці» (С. В. Зыгмантовіч), «Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу» (Р. А. Ровіна, В. А. Касап), «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» (Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава), «Менеджмент у бібліятэчнай справе (тэхналагічны бібліятэчны менеджмент)» (Л. І. Ракавецкая), «Библиотечный маркетинг» (Н. Я. Пятушка), «Методы статанализа в библиотечно-информационной деятельности» ў 2-х частках (В. В. Нешытой) і інш. па напрамках спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

Матэрыялы навуковых даследаванняў укараняюцца ў вучэбны працэс ФІДК. Распрацаваны такія аўтарскія дысцыпліны, як «Асновы навукова-даследчай работы», «Інфармацыйная культура асобы», «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі» (В. Е. Лявончыкаў), «Дакументалогія» (В. А. Касап), «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» (М. А. Яцэвіч), «Алгарытмізацыя і праграмаванне бібліятэчна-інфармацыйных задач» (А. Р. Зязюля), «Электронныя бібліятэкі», «Тэхналогія стварэння вэб-сайтаў», «Пошукавыя сістэмы сеткі Інтэрнэт» (А. А. Кутавенка), «Інфармацыйна-лінгвістычнае забеспячэнне АБІС», «Праектаванне АБІС» (С. У. Ільіна), «Інфармацыйны маніторынг» (Б. В. Пятрэнка), «Інфармацый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае забеспячэнне маркетынгавай дзейнасці прадпрыемства» (А. Е. Далгаполава), «Інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўстве і турызме» (А. В. Прадзеіна), «Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства» (Ж. Л. Раманава), «Інфармацыйны рынак і яго прававое забеспячэнне» (Ю. М. Галкоўская), «Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент» (Л. І. Ракавецкая), «Бібліятэчная канфліктaлогія», «Псіхалогія і сацыялогія чытання» (Н. У. Клімянкова), «Бібліятэчны фандрэйзінг» (Ю. А. Пераверзева), «Бібліятэчная сацыяноміка», «Інавацыйны менеджмент», «Офіс-менеджмент» (Н. Я. Пятушка), «Паблік рылейшнз і бібліятэчная рэклама» (С. А. Паўлава), «Кіраванне персаналам бібліятэкі», «Менеджмент якасці дзейнасці бібліятэк» (С. В. Зыгмантовіч) і інш. Па многіх пералічаных дысцыплінах выдадзены вучэбныя ці навукова-практычныя дапаможнікі, напрыклад, «Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь» (Ю. М. Галкоўская), «Библиотечная реклама» (Л. А. Дзямешка), «Информационное обеспечение маркетинга: теория и практика» (А. Е. Далгаполава), «Кіраванне персаналам бібліятэкі» (С. В. Зыгмантовіч), «Авторитетные/нормативные базы данных в АБИС» (С. У. Ільіна), «Патентно-информационная деятельность в библиотеке» (В. А. Касап).

Вынікі даследаванняў навукова-педагагічнай школы ўкараняюцца ў інфармацыйна-бібліятэчную практыку. На базе найбуйнейшых бібліятэк Беларусі былі створаны вучэбна-навукова-вытворчыя комплексы, што дало магчымасць каардынаваць і праводзіць навуковыя і навукова-метадычныя распрацоўкі, канферэнцыі, семінары, круглыя сталы; займацца апаніраваннем дысертацыйных даследаванняў; рэцэнзаваць навуковыя і навукова-метадычныя выданні; выконваць дысертацыйныя даследаванні, дыпломныя работы, якія максімальна набліжаны да бібліятэчнай практыкі.

Навукова-педагагічная школа мае стасункі з айчыннымі і замежнымі навуковымі ўстановамі, універсітэтамі, найбуйнейшымі бібліятэкамі і грамадскімі аб’яднаннямі. Сярод айчынных: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, усе галіновыя рэспубліканскія бібліятэкі Беларусі, Інстытут беларускай культуры, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА), грамадскае аб’яднанне «Беларуская акадэмія адукацыі». Сярод замежных: Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут культуры, Казанскі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Краснадарскі дзяржаўны інстытут культуры, Чэлябінская дзяржаўная акадэмія культуры і мастацтваў, Арлоўскі дзяржаўны інстытут мастацтваў і культуры, Смаленскі дзяржаўны інстытут мастацтваў (Расія), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Харкаўскі нацыянальны ўніверсітэт мастацтваў, Ровенскі дзяржаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны гуманітарны ўніверсітэт (Украіна), Вільнюскі ўніверсітэт (Літва), Вроцлаўскі ўніверсітэт (Польшча), Сафійскі ўніверсітэт бібліятэказнаўства і інфармацыйных тэхналогій (Балгарыя), Універсітэт Інха (Рэспубліка Карэя), Вестфальскі ўніверсітет імя Вільгельма, Вышэйшая школа тэхнікі, эканомікі і культуры (Германія); ГА «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі» (г. Масква) і інш. Толькі за апошнія гады на ФІДК адбылося звыш 25 майстар-класаў вядомых замежных вучоных у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці з Балгарыі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Польшчы, Расіі, Украіны.

Навуковая школа вядома далёка за межамі Беларусі, мае грамадскае прызнанне. Яе члены маюць ганаровыя званні, узнагароджаны медалямі, нагруднымі знакамі міністэрстваў, міжнароднымі дыпломамі. Навукоўцы з'яўляюцца правадзейнымі членамі (акадэмікамі, членамі-карэспандэнтамі) ГА «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі пры ААН» (г. Масква), ГА «Беларуская акадэмія адукацыі», Міжнароднай Кірыла-Мяфодзіеўскай акадэміі славянскай асветы; членамі рэдкалегій і рэдакцыйных саветаў айчынных і замежных навуковых часопісаў і зборнікаў; аргкамітэтаў міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый; навуковых экспертных, навукова-тэхнічных, навукова-метадычных саветаў, вучэбна-метадычных аб'яднанняў; савета па абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 05.25.03 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (першым старшынёй гэтага савета быў прафесар В. Е. Лявончыкаў, пазней – прафесар Я. Д. Грыгаровіч, а цяпер – прафесар Р. С. Матульскі).

У дзейнасці навуковай школы ўзнікаюць і пэўныя праблемы. Адна з асноўных – неабходнасць падрыхтоўкі новага пакалення навукова-педагагічных кадраў. Асабліва гэта датычыцца дактароў навук. Функцыянаванне савета па абароне кандыдацкіх дысертацый у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК магчыма, калі ў яго склад уваходзіць не менш чатырох дактароў навук па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства». У Беларусі іх толькі тры, таму ў склад савета ўваходзіць доктар навук з Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры. Калі сітуацыя не палепшыцца ў найбліжэйшы час, то пад пагрозай апынецца дзейнасць савета, а значыць, і нацыянальная сістэма падрыхтоўкі навуковых кадраў у галіне бібліятэказнаўства.

Існуюць цяжкасці і ў падрыхтоўцы кандыдатаў навук. У апошні час у саіскальнікаў вучонай ступені стаў фарміравацца сіндром так званага педагагічнага аспекту. Спецыяльнасць 05.25.03 адносіцца да педагагічных навук, а яны патрабуюць педагагічнага эксперымента, які ва ўмовах бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ажыццявіць няпроста. Таму па-за межамі навуковай дзейнасці засталіся запатрабаваныя бібліятэчнай практыкай напрамкі навуковых даследаванняў. У адрозненне ад нашых суседзяў з Расіі, Украіны, дзе педагагічны эксперымент не патрабуецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Украіна пайшла яшчэ далей. Яна выйшла з навуковага напрамку педагогікі і перайшла ў камунікацыі. Зараз саіскальнікам вучоных ступеней па спецыяльнасці «кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» там прысвойваецца вучоная ступень кандыдата навук у галіне камунікацый. Бібліятэказнаўцам з Расіі ўдалося абгрунтаваць перад ВАК самастойнасць бібліятэказнаўчых і кнігазнаўчых даследаванняў без абавязковага педагагічнага аспекту. Нам – не. Таму значная колькасць неабходных бібліятэказнаўчых даследаванняў так і не была легітымізавана ў навуцы. Гэта адбівае ў маладых людзей жаданне працягваць навучанне ў аспірантуры, нават калі яны ўжо скончылі навукова-арыентаваную магістратуру.

Навукова-арыентаваная магістратура з'яўляецца асновай падрыхтоўкі будучых кандыдатаў навук. У Беларусі магістратура шчыльна звязана з аспірантурай: падчас навучання ў ёй здаюцца кандыдацкія экзамены, што дазваляе ўжо ў аспірантуры засяродзіць увагу толькі на падрыхтоўцы кандыдацкай дысертацыі. Але і тут ёсць абмежаванні. Выпускнік магістратуры ў адпаведнасці з Палажэннем ВАК Беларусі аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь не можа паступаць у аспірантуру па педагагічным профілі, калі не мае двух гадоў педагагічнага (бібліятэчнага) стажу работы па спецыяльнасці. Таму студэнты, якія ўжо на старшых курсах навучання арыентаваны на навуковую дзейнасць, магістратуру і аспірантуру, вымушаны набываць стаж работы падчас вучобы, што не заўсёды спрыяе якасці навучання. Акрамя таго, на дзяржаўным узроўні не прыняты адпаведныя нарматыўна-прававыя дакументы, якія б вызначалі сацыяльны статус выпускніка магістратуры: пералік пасад, якія ён можа прыярытэтна займаць без прад'яўлення патрабаванняў да стажу работы; стасункі з аспірантурай. Прыняцце такіх дакументаў дазволіць падняць прэстыж магістарскай падрыхтоўкі, прывядзе да павышэння конкурсу пры паступленні ў магістратуру, дасць магчымасць у перспектыве падрыхтаваць будучых кандыдатаў навук. Больш актыўна ў справе падрыхтоўкі магістрантаў і аспірантаў павінны дзейнічаць найбуйнейшыя навуковыя бібліятэкі Беларусі, у першую чаргу Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

За гады дзейнасці навукова-педагагічнай школы, як адзначалася вышэй, выдадзена шмат публікацый, але сярод іх яшчэ недастаткова манаграфій, навуковых артыкулаў у рэцэнзуемых выданнях, якія ўваходзяць у пералік ВАК Беларусі, а таксама публікацый за межамі нашай краіны.

Важным напрамкам удасканалення дзейнасці школы з'яўляецца яшчэ больш шчыльнае ўзаемадзеянне з іншымі ўстановамі (бібліятэкамі), якія праводзяць бібліятэказнаўчыя і кнігазнаўчыя даследаванні, хаця такая практыка і зараз існуе. Не ўдалося ўвайсці ў склад дзяржаўных навуковых праграм і тэм, хаця асобныя прадстаўнікі навукова-педагагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школы выконваюць навуковыя даследаванні па праграме «Культура Беларусі». Пакуль слаба выкарыстоўваюцца магчымасці пастаянна дзеючага метадалагічнага семінара «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» для навуковага аналізу праблем тэорыі і практыкі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, арганізацыі і методыкі падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Да выканання навуковых даследаванняў неабходна больш актыўна далучаць студэнцкую моладзь – праз арганізацыю навуковых аб'яднанняў, напісанне курсавых і дыпломных работ, магістарскіх дысертацый, распрацоўку асобных праектаў у межах навуковых даследаванняў спецыяльных кафедраў БДУКМ і найбуйнейшых бібліятэк краіны.

Такім чынам, навукова-педагагічная школа «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» мае значныя дасягненні. Яе дзейнасць цалкам адпавядае патрабаванням ВАК Беларусі, якія прад'яўляюцца да такіх навуковых утварэнняў. Перспектывы развіцця павінны быць звязаны з асэнсаваннем падыходаў да месца і ролі бібліятэк у сучасных сацыяльна-эканамічных, інавацыйных і інфармацыйна-камунікацыйных умовах, а таксама падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у адпаведнасці з асноўнымі патрабаваннямі Балонскага працэсу.

*M. Yatsevich*

**Scientific and pedagogical school in the field of library science, bibliography and bibliology (for the 20th anniversary of creation)**

*The author of the article analyzes the formation of scientific and pedagogical schools in the field of library science, bibliography and bibliology of the Belarusian State University of Culture and Arts. The organization of the school and its achievements over the 20 years of existence are described: theses, researches, published academic and scientifically-practical manuals, published programs of the study disciplines, articles, monographs, collections of articles, etc. The author notes a number of problems arising in the activities of the scientific school, and suggests the ways of their salvation.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 06.08.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ